Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

ПРА КАЛІНАВЫЯ ПІРАЖКІ І СІМПАТЫЮ

Каліну я не люблю. Дакладней, не любіла да ўчарашняга вечара. А з сённяшняга ранку перад люстэркам у ванным пакоі сама сабе паабяцала да гэтай ягады добра прыгледзецца. У сэнсе палюбіць. Нехта з тых, чые словы перадаюцца з веку ў век пад вокладкамі розных «Антычных афарызмаў» ды іншых «Перлін думкі», неяк выказаўся, што зрабіць ворага сваім сябрам — гэта найлепшы з варыянтаў яго, ворага, знішчэння. Слушна.

Усё пачалося з таго, што нейкая Калініна, жанчына з прывабнымі рысамі твару, прыемным голасам і… Вось што яшчэ абавязкова дадаў бы сюды наш пісьменнік, дык гэта «… і гнуткім станам». Наш пісьменнік, дарэчы, нават і сам не заўважыў, як і калі пачаў пісаць прадказальна. Не ў сэнсе, што ў яго атрымліваюцца прароцкія рэчы, а ў сэнсе, што вельмі ўжо часта, прачытаўшы пачатак сказу, лёгка можна сфармуляваць яго працяг. «У вачах запаліўся…» чытаеш — і прадбачыш «агеньчык», і не іначай як «вясёлы» або «хітры». А потым кажаш: «Брава!» Не пісьменніку, вядома, — сабе. Бо чытаеш-такі: «… вясёлы хітраваты агеньчык». Ну калі ўжо хто з пісьменнікаў прыдумае рабіць з вачыма штосьці іншае, акрамя як запальваць у іх агеньчыкі? Прадбачу, што адбудзецца гэта тады ж, калі жаданні перастануць быць толькі запаветнымі, змены — спрэс кардынальнымі, сустрэчы — выключна незабыўнымі, тэрыторыі — абавязкова неабдымнымі, а часткі чаго б там ні было — неад'емнымі. Але для гэтага трэба хаця б перастаць «ляцець на крылах» за «небакрай» і пачаць перамяшчацца ў самых розных кірунках і нейкім, што ні кажы, адмыслова іншым чынам, кожны дзень па-новаму. Інакш «гонар беларускага прыгожага пісьменства» не «застанецца жыццёвым спадарожнікам», «верны сваёй даўняй традыцыі», а «цягам пражытых гадоў» «сыдзе на тлен». Але я далёка адступілася.

Дык вось тая Калініна, уся такая ж прывабная, як і прозвішча, пачала адведваць нас кожны вечар. Дакладней сказаць, панадзілася. І так ветліва, з такой інтэлігентнай упэўненасцю расказвае: то пра чаромху — як сушыць яе атрутныя ягады, каб атрымаць з іх начынку для пірага, то пра скрыпень — як займацца ферментацыяй яго лісцікаў у хатняй вытворчасці гарбаты, то пра… Ну, вось учора пра каліну расказвала. І так Ён, мой муж, на гэту Калініну з канапы глядзеў, так уважліва слухаў, так пасля перадаваў свае ўражанні («Ты бач, і прозвішча ў яе — Калініна»), што была б я Ліпніцкай — далібог, пабіла б тэлевізар. Але я толькі ўзяла ў рукі качалку — зручную такую, гладкую, з ліпы.

— Дык што, яна казала, з каліны можна згатаваць?

— Піражкі з яе смачныя ўдаюцца.

— Яна ж горкая.

— Дадай больш цукру.

«Дзівак, ад цукру горыч не праходзіць», — канстатую я ў думках. І тым часам успамінаю, што на каліне ў вёсцы засталося вісець шмат ягад. Птушкі на іх чамусьці дагэтуль не паквапіліся.

— Меню на падвячорак у наступную нядзелю: калінавыя піражкі пад скрыпнёвую гарбату.

— Прымаецца.

Ён усміхаецца. Ён усміхаецца так, як толькі можа ўсміхацца чалавек, які не ведае, што яго чакае. Я таксама люблю невядомасць, інакш і да слова пісьменніка не чаплялася б. Але, здаецца, ведаю не толькі тое, што тэлепраграму Ганны Калінінай мы будзем цяпер глядзець разам (цікавая рэч!), але і тое, наколькі стваральнай можа быць энергія… Не, не рэўнасці. Салідарнасці.

Бо і ў мяне таксама здараюцца сімпатыі. Яны ўвесь час мяне да нечага штурхаюць. То я ўводжу ў звычку ўставаць а шостай раніцы, каб бегчы крос, бо трэба рыхтаваць сябе да палёту ў космас, то ў шостым класе наведваю ўрокі астраноміі для дзесяцікласнікаў, каб стаць космабіёлагам, то запісваюся на курсы англійскай, каб разумець, пра што спявае кумір, то раптоўна пачынаю пісаць вершы, уступаю ў фанклуб, то апантана трэніру памяць завучваннем гістарычных дат, то жадаю праводзіць дні ў жаночых манастырах, дзіцячых вёсках, калійных шахтах… Капернік, Аліса Селязнёва, Дзітэр Болен, Высоцкі, Гюго, Гіляроўскі… Спрэс фанатызм. Сімпатыі, якія мяне стваралі.

Калінавыя піражкі ў мяне таксама атрымаюцца. Дзеля Яго.

■

ПАПІЦЬ КАВЫ… БЕЗ ДАЛЕЙШЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ?

НЕ ТРЭБА «ШУКАЦЬ ФРЭЙДА» ТАМ, ДЗЕ ЯГО НЯМА

«Колькі чалавек на свет нарадзілася дзякуючы кубачку кавы!» Гэты жарт знаёмы многім. Ці сапраўды запрашэнне на каву мае такія «незваротныя наступствы»? Што ўкладаюць у паняцце «папіць кавы» з прадстаўніцай прыгожага полу мужчыны і як успрымаюць такія запрашэнні жанчыны?

Асабіста мне неаднойчы даводзілася чуць у тэлефоннай трубцы ўзрушанае: «Ён запрасіў мяне на каву!» ад сяброўак і знаёмых. І амаль адразу за гэтым ішлі пытанні: «А як ты думаеш: што надзець? А раптам ён мяне запросіць да сябе?».

Забягаючы наперад скажу, што жанчыны вельмі крыўдзіліся, калі ў «кавы» не было працягу (мужчыны, майце на ўвазе!).

«І гэта зразумела, — кажа мая знаёмая Кацярына, — напрыклад, у маім дашлюбным жыцці «папіць кавы» заўсёды азначала спатканне. (Не блытаць з запрашэннем заняцца сексам!) Мужчыны прапаноўвалі сустрэцца за «кубачкам кавы», каб пазнаёміцца бліжэй, пагутарыць, нешта абмеркаваць. Кава — гэта ўсё ж такі двухсэнсоўная рэч».

З Кацярынай катэгарычна не згодна Настасся. Яна лічыць, што прадстаўніцы слабай паловы залішне сабе фантазіруюць наконт кавы, надаючы ёй зашмат значэння. «Кава — гэта проста кава. Не трэба «шукаць Фрэйда» там, дзе яго няма!»

Настасся ўпэўнена, што жанчына заўсёды ведае (інстынктыўна гэта адчувае!): дабіваецца яе мужчына ці не, таму гульня ў разважанні на тэму «а што ён меў на ўвазе пад кубачкам кавы?» — гэта толькі какецтва.

— Згаджацца ці не? Калі падабаецца мужчына — так, згаджайцеся, не падабаецца — можна папіць кавы без абавязацельстваў, — гаворыць Настасся.

Яна прызнаецца, што адносіны з процілеглым полам у яе паміж сабой можна толькі далучыцца. Вельмі люблю каву і п'ю кожны дзень!» — гаворыць яна.

«Калі жанчыне прапаноўваюць «папіць кавы» і гэта адбываецца не ў офісе, то адназначна ў мужчыны ёсць патаемныя намеры і ён прэтэндуе на працяг адносін, — кажа Яраслаў. — І я ўпэўнены, што ўсе жанчыны

чыналіся па-рознаму: і з кавы, і з віна, і нават з піва. «Калі жанчыне не падабаецца прадстаўнік процілеглага полу, то ўсе кропкі над «і» лепш расставіць загадзя.

Настассю падтрымлівае Стэла. «Для мяне кава — гэта таксама толькі кава. І мяне «на яе» немагчыма запрасіць. Да цудоўна разумеюць, якія намеры ўкладвае ў «кубачак кавы» мужчына!»

— А калі жанчына робіць выгляд, што не разумее двухсэнсоўнасці «кавы»? Альбо вырашыла падурыць хлопцу галаву і пакакетнічаць? — правакую Яраслава.

«Калі жанчыне прапаноўваюць «папіць кавы» і гэта адбываецца не ў офісе, то адназначна ў мужчыны ёсць патаемныя намеры і ён прэтэндуе на працяг адносін, — кажа Яраслаў. — І я ўпэўнены, што ўсе жанчыны цудоўна разумеюць, якія намеры ўкладвае ў «кубачак кавы» мужчына!»

Настасся ўпэўнена, што жанчына заўсёды ведае (інстынктыўна гэта адчувае!): дабіваецца яе мужчына ці не, таму гульня ў разважанні на тэму «а што ён меў на ўвазе пад кубачкам кавы?» — гэта толькі какецтва.

— Ну, калі яна робіць выгляд, што не зразумела, то… і выдаткі ж невялікія. Можна і яшчэ некалькі разоў запрасіць.

«Я таксама, калі хачу бліжэй пазнаёміцца з дзяўчынай, якая спадабалася, запрашаю яе на каву, — прызнаецца Генадзь. — За кубачкам можна даведацца аб яе поглядах, напрыклад, на тое, якімі павінны быць адносіны ў сям'і (Генадзь, як і Яраслаў, нежанаты), зразумець ці сумяшчальныя мы псіхалагічна. Трэба ж уважліва ставіцца да выбару будучай «палавінкі».

Такую ж пазіцыю наконт «кубачка кавы» занялі і многія іншыя з апытаных мной нежанатых мужчын. Стала цікава: «А што ўкладаюць у паняцце «папіць кавы» з жанчынай несвабодныя мужчыны? У іх жа ўжо ёсць «другія палавінкі»?

— Вельмі правакацыйнае пытанне для жанатага чалавека, — смяецца Аляксандр. — Адкажу так: і мужчыну, і жанчыну прырода стварыла такім чынам, што яны знаходзяцца ў стане пастаяннага палявання адно на аднаго, нават тады, калі «ежа» (свая «палавінка») знойдзена. Таму і звычайны кубачак кавы можа прывесці да непрадказальных наступстваў. Ведаю шмат пар, у якіх «паляванне» пачыналася менавіта з кубачка кавы. Зразумела, жанчыне лепш не разлічваць на тое, што пасля кавы яе адразу запросяць у ЗАГС, але неабходна мець на ўвазе, што прыемны вечар пасля кавы можа мець працяг.

Як бачым, кубачак кавы ўсё ж такі рэч неадназначная, нават з пункту гледжання несвабоднага мужчыны. Але, калі прадстаўнік моцнага полу ўсё ж запрасіў вас на каву, можна дазволіць сабе крыху пакакетнічаць. Гэта мужчыну не спужае, а толькі больш распаліць інстынкт паляўнічага! А што далей?.. Вырашайце самі.

Гелена АВЕЛА.

■ Матуліны занатоўкі

Ад шлагбаума да залатой рыбкі

Сустрэліся на дзіцячай пляцоўцы з суседкай. Пакуль мой Антон і яе Алеся, усмешлівая і вельмі кантактная асоба двух з паловай гадоў, будавалі ў пясочніцы чыгунку, мы чарговы раз заняліся абмеркаваннем новых уменняў сваіх дзяцей. Нам заўжды ёсць што абмеркаваць: Алеся ж усяго на два месяцы старэйшая за Антона… Але гэтым разам мне давялося слухаць адзін працяглы суседчын маналог з нагоды нядаўняга візіту ў дзіцячую паліклініку, дзе Алесі паставілі дыягназ «затрымка нервова-псіхічнага развіцця». І выпісалі аж тры найменні лекаў, якія павінны дапамагчы ёй загаварыць. Я, безумоўна, не ўрач, але Алесю ведаю ці не з яе першага дня нараджэння. І што-што, а нешта там «нервова-псіхічнае» — гэта дакладна не пра яе. Ды і са слыхам у малой яўна добра. Ну не размаўляе яна сказамі — дык што? Вунь як выдатна паразумеліся з Антонам…

Згадваю, як сама першы раз завітала ў дзіцячую паліклініку. Сыну толькі споўніўся месяц, і мы з ім мусілі зайсці да хірурга, артапеда, неўролага, афтальмолага… Спіс урачоў, абавязковых да наведвання ў гэтым узросце, уражвае сам па сабе, але ўчастковы педыятр накіраваў нас яшчэ да кардыёлага з уролагам — «на ўсялякі выпадак». Ніводзін урач не прызнаў

Антона цалкам здаровым, і кожны выпісаў нам нешта ў кроплях ці парашках. Дома я перагледзела ўсе рэцэпты і жахнулася — месячнаму дзіцяці прапаноўвалася 9 розных лекаў, ды яшчэ некалькі разоў на дзень! Проста «на ўсялякі выпадак». Нічога сур`ёзнага, што патрабавала б сапраўднага лячэння, у Антона не знайшлі. І кожны са спецыялістаў шчыра прызнаў, што свае дробныя недасканаласці арганізм малечы, хутчэй за ўсё, неўзабаве перарасце. Але, маўляў, раз вы ўжо да нас прыйшлі… У выніку я вырашыла не даваць сыну нічога, акрамя адзінага сродку (пра што потым не раз пашкадавала, але гэта зусім іншая гісторыя). Праз колькі месяцаў ад усіх «дыягназаў» і следу не засталося.

Ну праўда ж — 30, 40, 50 гадоў таму, калі не было такога багатага выбару лекаў, маленькіх дзяцей лячылі ў выключных, сапраўды сур'ёзных выпадках. І ўсе — хто раней, хто пазней — выдатна навучыліся бегаць і размаўляць. Мая найлепшая сяброўка, напрыклад, сцвярджае, што майстэрства карыстацца словамі ёй не давалася да трох гадоў. Дык мне б яе сённяшняе ўменне весці філасофскія гутаркі! Пры тым, што я, па сведчанні бацькоў, загаварыла вельмі рана. Амаль на год раней за свайго брата, з якім мы нарадзіліся ў адзін дзень з розніцай у 10 хвілін…

Кажуць, што час, калі дзіця пачынае гаварыць, не ў апошняй ступені залежыць ад спадчыннасці. Напэўна, у нашых з братам бацькоў гэты працэс распачаўся таксама вельмі па-рознаму (толькі нашы, абедзьве шматдзетныя, бабулі такімі «дробязямі» не заклапочваліся і першыя словы сваіх далёка не першых дзяцей у памяці не захавалі)… Зрэшты, як адказная маці, яшчэ падчас цяжарнасці я паспрабавала вызначыць, што мне трэба рабіць, каб маё дзіця пачало размаўляць належным чынам у належны тэрмін. І… заблыталася ў шматлікіх тэорыях. Напрыклад, адны даследчыкі сцвярджаюць, што важней за ўсё колькасць слоў, якія чуе малое ад маці на працягу дня. Прычым запамінаць гэтыя словы дзіця пачынае задоўга да нараджэння. Іншыя ж лічаць, што ўсё гэта не мае ніякага значэння, а галоўная задача дарослых — навучыць немаўля ўважліва слухаць хоць магнітафонную стужку. Стаць для малога прыкладам не столькі актыўнага суразмоўцы, колькі пільнага слухача… Урэшце для мяне стала відавочным: не зважаючы на ўсе дасягненні цывілізацыі, з'яўленне чалавечага маўлення дагэтуль застаецца таямніцай. У чым пазней асабіста і пераканалася.

Ледзь не сто гадоў псіхолагі спрабуюць вызначыць, колькі слоў павінны ведаць дзеці кожнага ўзросту. Але малыя да трох гадоў вельмі адрозніваюцца адно ад аднаго, каб падлічыць нешта сярэдняе. Урэшце, за норму (якой кіраваліся яшчэ савецкія педыятры) прынялі вынікі даследаванняў аўстрыйска-амерыканскага псіхолага Шарлоты Бюлер, якая падлічыла, што, напрыклад, у год і тры месяцы мінімальны слоўнік дзіцяці складае… усяго 4 словы. А максімальны — аж 232!

Дык вось, у год і тры месяцы слоўнік Антона быў нулявы. Я безупынна размаўляла з ім, мы бясконца слухалі разам усё, што толькі можна слухаць, але ўся Антонава «гутарка» зводзілася да паказвання пальцам на рэчы, якія яму хацелася пакруціць ці пагрызці… А мінулай зімой, тупаючы са мною ў краму, ён раптам прыпыніўся каля шлагбаума, што трапіўся нам па дарозе, і вельмі выразна вымавіў: «Шлагбаум». Пасля чаго замаўчаў яшчэ на тры месяцы. Наступным словам было класічнае «Дай!»… А ў дзень, калі сыну споўнілася два гады, словы пасыпаліся з яго, быццам з чароўнага куфэрка. Неўзабаве ён нават пачаў прыдумляць казкі, якія я толькі паспявала запісваць. Скажам, улюбёны Антонаў персанаж — вялікі чорны сабака Паксі, які жыве ў будцы разам з гаспадаром і ходзіць на працу запускаць фантаны. Апошнім разам, напрыклад, з Паксінага фантана выплыў карабель, з якога саскочыла малпачка. І цяпер Паксі вымушаны тэрмінова будаваць новую будку, бо ў старой даўно не хапае месца для ўсіх, каго Паксі прывёў туды жыць яшчэ да сустрэчы з малпачкай… Калі б раней мне сказалі, што двухгадовае дзіця складае падобныя гісторыі, дакладна не паверыла б! Ды што я ведала пра дзяцей раней?.. І што ведаю пра свайго Антона цяпер?

Падбягае да мяне хвіліну таму: «Мама, я прыдумаў, што Дзед Мароз падорыць мне праз год! Залатую рыбку. І ў мяне заўжды будзе шмат новых машынак!» Вам такое прыйдзе ў галаву?

Дарэчы, калі напярэдадні Новага года мы запыталіся, што Антон хацеў бы атрымаць ад Дзеда Мароза, ён вымавіў толькі адно слова: «Чыз!» Не зразумеўшы, мы перапыталіся. «Гэта каб усе ўсміхаліся, — удакладніў сын. — І яшчэ адну машынку»…

Марына БЕРАЗЕНСКАЯ.

■ Паміж намі...

ЖАНЧЫНЫ ТАКСАМА СЯБРУЮЦЬ

Кажуць, што жаночай дружбы не бывае. Бывае, бывае! Інакш як назваць гэтую яе амаль паталагічную патрэбу бачыць мяне штодня, лезці ва ўсе мае справы са сваімі парадамі, разглядаць «пад лупай» майго чарговага знаёмага і надакучаць, надакучаць, надакучаць…

Наогул, жаночае сяброўства — гэта штосьці асаблівае! Спачатку яна зайздросціць тваёй свабодзе, сукенцы, працы… Потым моцна перажывае, калі ты няўдала выйшла замуж, не можаш «улезці» ў сукенку ці звольнілася, нарэшце, з абрыдлай працы.

Сяброўства — гэта калі яна ваюе з тваім мужам, адстойваючы тваю правату, нават калі ты зусім не маеш рацыі; цягне ў твой дом набытыя на апошнія грошы прадукты, калі твае фінансы зусім «расталі» падчас пошукаў новай працы. Яна вечна корпаецца ў тваёй душы са шчырым жаданнем навесці там парадак… Нават у далёкай паездцы, калі ты, маючы намер забыцца на час аб праблемах, займаеш верхнюю паліцу купэ, разгортваеш любімую кнігу і… На табе! Звініць мабільны, і знаёмы голас паведамляе, што вось, маўляў, месца сабе не знаходжу, таму што ты там адна, бесталковая, і абавязкова ці заблудзішся, ці што-небудзь важнае забудзеш, і наогул, трымайся далей ад незнаёмых мужыкоў, усе яны сво… А ў суседкі зноў новы палюбоўнік… А тое футрачка, якое ты купіла перад ад'ездам, яно табе, ведаеш, неяк не вельмі, і калі вырашыш прадаваць, то я, так і быць, куплю… Тэлефон награваецца, ты адчуваеш, што вось-вось узарвешся, суседзі па купэ раздражнёна варочаюцца. Але адмовіцца ад размовы — ні-ні, таму што тады будзеш мець усе магчымыя непрыемнасці, пачынаючы з «Не хачу з табой больш размаўляць!» да «Пайду, нап'юся атруты…»

Карацей, наша жыццё без сяброўак было б складаным і сумным. Складаным, бо вельмі часта хочацца падзяліцца сваімі перажываннямі, а калі няма вернай сяброўкі — то няма з кім. Сумным, калі няма з кім падзяліць радасць — разам пасмяяцца з чарговай серыі «Адчайных хатніх гаспадынь», абмеркаваць суседку з першага ці апошняга (не ў гэтым сутнасць!) паверха, успомніць прыгоды падчас адпачынку…

Аднак ёсць сярод нас і тыя, каму не пашанцавала з сяброўкай. Чыясьці «разнесла» па ўсім горадзе чужую тайну, другая завяла раман з чужым мужам, трэцяя падманула… Безумоўна, праблемы і непаразуменні ўзнікаюць у любых адносінах, і жаночая дружба не выключэнне. Ніхто не застрахаваны ад крутых жыццёвых паваротаў. Але сапраўднае сяброўства можа пераадолець усё, бо яго галоўная каштоўнасць — гэта шчырыя чалавечыя зносіны. Такое сустракаецца не часта, і ім трэба даражыць. Што ж рабіць, каб нішто не магло азмрочыць дружбу?

Не «змешвайце» мужчын

Вашы кавалеры — гэта вашы кавалеры, а яе — гэта яе. Паклоннік сяброўкі — табу, ён хутчэй істота, якая не мае полу, і як патэнцыяльны мужчына не павінен разглядацца. І калі адна з вас парушыла гэтае правіла (жыццё ёсць жыццё!), то гаварыць пра сяброўства ўжо не прыходзіцца.

Не правакуйце зайздрасць

Усе мы людзі розныя, у нас розныя ўмовы жыцця, мужы, дзеці, начальнікі. Можа так здарыцца, што вы прыгажэйшая за сваю сяброўку, у вас багаты муж, які носіць вас на руках. А вось сяброўка мала таго што патаўсцела пасля родаў, дык і грошай не хапае, і муж «гуляе». Калі ў вас відавочная перавага, не хваліцеся, не правакуйце зайздрасць. Гэта ні да чога добрага не прывядзе. Будзьце сціплымі, расказваючы пра свае ўдачы; дзяліцеся перажываннямі. Хай сяброўка ўбачыць, што і ў вас ёсць праблемы.

Не прыніжайце

Нямногія людзі могуць пахваліцца жалезнай сілай волі. Таму калі ваша сяброўка слабахарактарная (напрыклад, нягледзячы на залішнюю вагу, не можа ўтрымацца ад шакаладкі), не прыніжайце яе словамі «ды куды табе — у люстэрка паглядзі».

Не прасіце ў доўг

Як вядома, даўгі маюць здольнасць разбураць добрыя адносіны і ператвараць сяброў у ворагаў. Таму старайцеся не прасіць і не даваць у доўг. А калі пазычылі, будзьце гатовыя да таго, што вы гэтыя грошы падарылі. Проста са спагады. Наогул, рэкамендуецца не ўмешваць у стасункі фінансы — яны заўсёды ўсё псуюць. Аддадуць не ў час, не ўсю суму, давядзецца нагадваць пра пазыку… Якое ўжо тут сяброўства…

Не судзіце строга

Сяброўкі часта звяртаюцца адна да адной па параду ў хвіліны смутку, расчаравання, працоўных няўдач. У такія моманты людзі найбольш уразлівыя. Нават калі вы лічыце, што сяброўка дзейнічала непрадбачліва, непрыгожа, не судзіце яе занадта строга. Яна ж прыйшла да вас па разуменне, а не па «рашэнне суда».

Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

Якая вы сяброўка?

Тое, як мы сябе паводзім з сябрамі, можа шмат што пра нас расказаць. Пратэсціруйце сябе і зрабіце высновы.

Пытанні тэсту:

1. Сяброўка прапануе прайсціся па крамах, а ў вас няма ні грошай, ні настрою. Што вы будзеце рабіць?

а) Пагодзіцеся, каб дапамагчы ёй з пакупкамі.

б) Пойдзеце, каб развеяцца.

в) Адмовіцеся, каб не засмучацца лішні раз.

2. У краме вам абедзвюм спадабалася сукенка, якая засталася ў адзіным экземпляры. Вашы дзеянні…

а) Саступіце яе сяброўцы.

б) Прапануеце купіць сукенку ў складчыну і насіць па чарзе.

в) Угаворыце яе аддаць сукенку вам.

3. Сяброўка пазнаёміла вас са сваім новым кавалерам, які вам зусім не спадабаўся. Ваша рэакцыя?

а) Пастараецеся пасябраваць з ім.

б) Прамаўчыце — галоўнае, каб падабаўся ёй.

в) Скажаце ёй усё, што пра яго думаеце.

4. Ці дзеліцеся вы сакрэтамі з сяброўкай?

а) Расказваеце ёй усё.

б) Дзеліцеся многім, але ёсць рэчы, пра якія яна не ведае.

в) Тайны на тое і тайны, каб ні з кім імі не дзяліцца.

5. Як вы рэагуеце, калі сяброўка вас крытыкуе?

а) Прымаеце ўсё блізка да сэрца.

б) Прыслухоўваецеся, калі крытыка абгрунтаваная.

в) У адказ гаворыце пра яе заганы.

6. Сяброўка прапануе схадзіць у кіно, але вам гэты фільм зусім не цікавы. Вы пагодзіцеся?

а) Вядома, трэба скласці ёй кампанію.

б) Так, але з умовай, што потым пойдзеце на ваш любімы фільм.

в) Не, няхай нават не ўгаворвае.

7. Ваша рамантычнае спатканне ў самым разгары, ажно тэлефануе сяброўка і просіць тэрмінова прыехаць да яе. Што вы зробіце?

а) Кінецеся на дапамогу.

б) Паспрабуеце па тэлефоне высветліць, што здарылася.

в) Папросіце яе патэлефанаваць раніцай.

Вынікі тэсту

Калі ў вас большасць адказаў «а», то вы — «сяброўка-падушка». Вы — безадмоўная альтруістка, гатовая на многае дзеля дружбы. На вас заўсёды можна абаперціся: і ў цяжкую хвіліну, і ў радасны момант. Але ўсё ж не варта забываць і пра сваё асабістае жыццё, інакш вы рызыкуеце загразнуць у чужых праблемах і клопатах.

Калі ў вас большасць адказаў «б», то вы — «сяброўка-дыпламат». Вы даражыце сваімі сябрамі, але пры гэтым стараецеся трымаць дыстанцыю. Вы заўсёды можаце знайсці кампраміс, які б задаволіў усіх. Калі трэба, то вы гатовы прыйсці на дапамогу, але старанна ўсё ўзважыце, перш чым ахвяраваць сваімі інтарэсамі.

Калі ў вас большасць адказаў «в», то вы — «сяброўка-ракавінка». Уласныя інтарэсы для вас на першым месцы, а халодны разлік не пакідае месца для эмоцый. Магчыма, вы не давяраеце людзям і баіцеся адкрыцца перад імі? Усё ж такі варта часам вылазіць са сваёй «ракавінкі», бо сапраўднае сяброўства здольнае даць шмат станоўчых эмоцый.